1. *Карлюкевич, А.* Камиль Камал: Восток и Восход в Беларуси / А. Карлюкевич // Звязда. – 2017. – 30 марта. – С. 4.

2. *Карлюкевіч, А. М.* Дарогі да Паднябеснай : артыкулы, эсэ, гутаркі / А. Карлюкевіч. – Мінск : Паліграфкамбінат імя Я. Коласа, 2019. – 191 с.

3. Ostashov [Изоматериал]: gift sculpture collections / [Авторская галерея Андрея Осташова]. – Минск, 2018. – 32 с.

4. *Шаранговіч, Н. В.* Гульні на краі зямлі : знакавы жывапіс Каміля Камала / Н. Шаранговіч // Роднае слова. – 2010. – № 5. – С. 95–97.

## ПРАБЛЕМА СУАДНОСІН ДЭСКРЫПТЫЎНАГА І НАРМАТЫЎНАГА АСПЕКТАЎ ФІЛАСОФІІ Ў ТВОРЧЫХ ПОШУКАХ ГЕГЕЛЯ

***А. І. Бабко,***
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі гуманітарных навук*
*установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў»*

Істотная важнасць праблемы суадносін дэскрыптыўнага і нарматыўнага аспектаў філасофскага пазнання абумоўліваецца яе глыбокай сувяззю з пытаннямі сутнасці філасофіі, яе сэнсу, яе месца ў грамадстве і культуры. У дачыненні да ўжывання паняцця дэскрыптыўнасці ў дадзеным кантэксце неабходна адзначыць, што пры яго суаднясенні з паняццем нарматыўнасці адбываецца пэўны зрух у яго семантыцы ў параўнанні з сітуацыяй, калі апісальныя працэдуры суадносяцца з тлумачальнымі, бо яго значэнне робіцца больш шырокім і ўключае ў сябе тлумачэнне. (Падобны зрух назіраецца ў семантыцы паняцця тэорыі, калі ў якасці яго паняційнага адпаведніка разглядаецца «практыка», якая саступае месца «досведу».)

Маючы справу з важнай праблемай, мы мусім мабілізаваць для яе рашэння ўсе інтэлектуальныя рэсурсы, якія назапасіла чалавечая думка. У дадзеным выпадку (як і ў шматлікіх іншых складаных пазнавальных сітуацыях) істотную дапамогу можна атрымаць у выніку дэталёвага аналізу і тэарэтычнай рэканструкцыі філасофскіх пошукаў і набыткаў Гегеля, што звязана найперш з магутным творчым патэнцыялам дыялектычнай метадалогіі, якая набыла ў яго даследаваннях класічную форму. Разам з тым паводле акрэсленай вышэй праблемы гегелеўскія развагі (як і іншыя аспекты гегелеўскай філасофіі) у сваю чаргу выступаюць як крыніца надзвычай цікавых пытанняў, здольных правакаваць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нязгоду, жаданне дыскутаваць і шукаць альтэрнатыўныя падыходы і рашэнні. Згаданыя развагі займаюць выдатнае месца ў гегелеўскай спадчыне. Праўда, адпаведная праблематыка фармулявалася і аналізавалася філосафам не ў тэрмінах дэскрыптыўнасці і нарматыўнасці. Тым не менш яго глыбока хвалявалі ўсе аспекты і нюансы дачыненняў паміж (філасофскім) мысленнем і (сацыяльным) быццём, і ён не мог не засяродзіць увагу на пытанні, з'яўляецца філасофія асэнсаваннем існага ці яна мае на мэце фармулёўку таго, што павінна быць, распрацоўку ідэальнай альтэрнатывы рэальнаму стану рэчаў.

Дыялектычная метадалогія патрабуе, відавочна, пошуку шляхоў, што вядуць да сінтэзу супрацьлеглых сцверджанняў, у тым ліку і прыведзеных вышэй. У адпаведнасці з гэтым патрабаваннем Гегель указвае на неадназначны характар дачынення філасофскага мыслення і сацыяльна-гістарычнай рэальнасці: з аднаго боку, філасофская ідэя завяршае пэўную форму ўладкавання грамадскага жыцця і пэўную гістарычную эпоху, а з іншага, – фігуруе як пачатак, план, праект новай рэчаіснай формы, новай эпохі. Падвойная скіраванасць філасофіі (на тое, што ёсць і што мае быць) абумоўлена канкрэтнай існасцю яе адзінства з грамадскай рэчаіснасцю: дадзенае адзінства ўключае ў сябе момант унутранага адрознення і таму выступае як жывое, рухомае, дынамічнае [4, с. 70–75].

Разам з тым, аднак, у гегелеўскіх тэкстах (асабліва ў «Філасофіі права») ёсць развагі, якія даюць важкія падставы для таго, каб паставіць пад пытанне яго паслядоўнасць у дыялектычным падыходзе да аналізу адпаведнай праблематыкі. Гэтыя развагі яскрава і недвухсэнсоўна сведчаць пра яго глыбокую непрыхільнасць да пункту гледжання, згодна з якім задача філасофіі – выяўляць належнае, што супрацьстаіць недасканаламу існаму, знаходзячыся ў непрымірымай апазіцыі да рэальнага стану рэчаў [3, с. 20–21].

У выніку паўстае досыць складаная сітуацыя. Калі характарызаваць яе пры дапамозе прынятых намі тэрмінаў, дык, выступаючы спачатку як нацэлены на выяўленне глыбокага, канкрэтнага адзінства апісальнага і «прадпісальнага» аспектаў філасофіі, гегелеўскі падыход набывае затым выгляд цалкам засяроджанага на артыкуляцыі адназначнага прыярытэту дэскрыптыўнага боку філасофскага пазнання.

Той момант, што ў пэўных тэкстах «сталага» Гегеля энергічна падкрэсліваецца неабходнасць для філасофіі засяроджвацца на існым, шукаючы прымірэння думкі і рэчаіснасці, нярэдка тлумачыцца (у пэўнай ступені) наяўным у іх палемічным аспектам (яскравы прыклад падае ў гэтым плане знакамітая прадмова да «Філасофіі права», у якой ён востра крытыкуе суб'ектывісцкія, на яго думку, погляды кантыянца Якаба Фрыдрыха Фрыза [3, с. 10–12]). Аднак найважнейшай прычынай такога

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стану рэчаў з’яўляецца той факт, што перакананне філосафа ў разумнасці сацыяльнага быцця ўмацоўвалася разам са сталеннем спароджанага Вялікай французскай рэвалюцыяй грамадства. Давер да адпаведнай формы грамадскага ўладкавання ніяк не спрыяў пошуку яго радыкальных альтэрнатыў. Таму рашучая акцэнтуацыя Гегелем прыярытэту дэскрыптыўнасці філасофскага мыслення перад яго нарматыўнасцю датычыць тагачаснай сацыякультурнай сітуацыі і яе гістарычных перспектыў, якія ён ацэньваў надзвычай высока.

Пакінуўшы ўбаку правамернасць згаданай ацэнкі (гэты сюжэт аналізаваўся ў іншым тэксце [1]), адзначым, што нават у сваёй «кансерватыўнай» версіі погляды філосафа выяўляюць у выніку дыялектычную натуру. Уважлівы аналіз яго пошукаў паказвае, што ён (ва ўсіх выпадках) не прымаў ідэі радыкальнага змянення грамадства на грунце абстрактных, пазбаўленых рэчаіснай асновы ўяўленняў аб яго дасканалым стане. На яго думку, задачай філасофіі з’яўляецца выяўленне такога належнага, якое карэніцца ў існым (г. зн. яе нарматыўнасць заўжды павінна вызначацца дэскрыптыўнасцю).

Ідэнтычны характар мае і сітуацыя са скіраванасцю філасофскай думкі на разумнае спасціжэнне рэчаіснасці (на яе апісанне і тлумачэнне, здзейсненае ў філасофскіх паняццях), бо яна не застаецца ў Гегеля аднабакова супрацьпастаўленай засяроджанасці філасофскага мыслення на належным (на сваім нарматыўным аспекце). Ён паказвае нам, што дэскрыптыўнасць філасофіі не можа не быць нарматыўнай. Пры гэтым нарматыўнасць выступае як складанае структураванае ўтварэнне. Выяўляючы, напрыклад, (аб’ектыўна) разумнае (суб’ектыўна) разумным чынам філасофскае мысленне задае агульныя (сёння ў нашым культурным асяродку мы называем іх светапогляднымі і метадалагічнымі) нормы разнастайных сацыяльных практык.

Патрэбна адзначыць, што ў адпаведным сегменце гегелеўскай спадчыны ёсць моманты, якія падаюцца не надта спрыяльнымі для выяўлення і разгортвання творчага патэнцыялу філасофіі. Гегель лічыць, што найглыбейшая логіка рэчаіснасці і яе філасофскага спасціжэння зададзена адназначна і можа (нават павінна) быць раскрыта ў адзінай філасофскай сістэме [5, с. 266]. Такая сістэма мусіць характарызавацца арганічным адзінствам дэскрыптыўнасці і нарматыўнасці, якое выключае альтэрнатыўныя варыянты апісання рэальнасці і прынцыпы дзейнасці ў ёй (усё адмысловае і асаблівае, што мае вартасць і значэнне, ахопліваецца ёю). З такой пазіцыяй наўрад ці можна пагадзіцца. Рэчаіснасць змяшчае каласальнае багацце тэндэнцый, яна ў найвышэйшай ступені багатая на магчымасці свайго самаразвіцця. Гэтыя магчымасці ствараюць аснову для разнастайных нарматыўных праектаў, што распрацоўваюцца ў абсягу розных філасофскіх кірункаў. У выніку



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

індывіды і іх групы ставяцца ва ўмовы, у якіх яны павінны рабіць выбар, браць на сябе цяжар і асалоду свабоды і творчасці.

Відавочна, што акрэслены вышэй падыход звязаны з высокай ацэнкай сітуацый, у якіх розныя паводле ступені і характару сваёй сувязі з аб'ектыўнымі ўмовамі чалавечай дзейнасці філасофскія праекты спаборнічаюць паміж сабой за статус нарматыўных. Сапраўды, тыя з іх, што не вытрымліваюць канкурэнцыі і выглядаюць нежыццяздольнымі сёння, могуць быць канкурэнтаздольнымі і запатрабаванымі ў будучым. Утопіі таксама маюць пэўныя карані ў рэчаіснасці і выконваюць у дачыненні да яе пэўную (і, магчыма, дастаткова важную) ролю [2, с. 19]. Філасофія заўжды выступала як своеасаблівая творчая лабараторыя, у якой сапраўднае і магчымае сутыкаюцца і звязваюцца паміж сабой самымі рознымі спосабамі.

Такім чынам, галоўны запавет Гегеля яго наступнікам у асэнсаванні суадносін дэскрыптыўнага і нарматыўнага пачаткаў філасофскага пазнання даводзіць аб эфектыўнасці дыялектычных стратэгій вырашэння адпаведных праблем і нацэльвае на пошук глыбокага і канкрэтнага адзінства згаданых пачаткаў. Кожны з іх павінен разглядацца як унутрана звязаны з іншым. Аднак з мысляром нельга пагадзіцца ў тым, што для філасофіі пажадана і неабходна звязаць іх у адзінай (апошняй і найвышэйшай) сістэме, бо рэчаіснасць заўжды выступае як значна больш багатая на магчымасці, варыянты і версіі свайго самаразвіцця, чым яму падавалася. Толькі ў тым выпадку, калі філасофская думка не ўнікне згаданай разнастайнасці, яна здолее выканаць сваю высокую місію ў грамадстве і культуры.

1. *Бабко, А. І.* Праблема месца і ролі філасофіі ў сацыяльнай дынаміцы: дыялектычны падыход Гегеля і сучаснасць / А. І. Бабко. // Культура. Наука. Творчество: XIII Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 75-летию освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков. Минск, 16 мая 2019 г. : сб. науч. ст. / М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств; редкол.: А. А. Корбут [и др.] – Минск : БГУКИ, 2019. – С. 45–50.

2. *Моисеев, Н. Н.* Универсальный эволюционизм (Позиция и следствия) / Н. Н.Моисеев // Вопросы философии. – 1991. – № 3. – С. 3–28.

3. *Hegel, G. W. F.* Grundlinien der Philosophie des Rechts, oder Naturrecht und Staatswissenschaft im Grundrisse / G. W. F. Hegel. – Hrsg. von Ed. Gans. – Berlin : Duncker und Humblot, 1833. – 440 S.

4. *Hegel, G. W. F.* Vorlesungen über die Geschichte der Philosophie: Erster Teil. / G. W. F. Hegel // Werke: in 20 Bd. / G. W. F. Hegel. – Bd. 18. – Frankfurt am Main: Suhrkamp, 1979. – 568 S.

5. *Inwood, M.* A Hegel Dictionary / M. Inwood. – Oxford: Wiley, 1992. – 356 p.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ